Источник: "Навука" - 2018-12-17

# ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ЗБОРНІКА




■ Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі запрашае 18 снежня 2018 г. у 15.00 на прэзентацыю зборніка «Евангельская Царква Беларусі: гісторыя і сучаснасць» (Выпускі I–III).

Зборнік «Евангельская Царква Беларусі: гісторыя і сучаснасць» выдаецца з 2014 года. На сёння выйшла тры тамы матэрыялаў (2014, 2016 і 2018 гг.), якія адлюстроўваюць гісторыю беларускага і заходнееўрапейскага пратэстантызму.

Трэці выпуск «Евангельскай Царквы Беларусі» – вынік правядзення III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Евангельская Царква Беларусі: гісторыя і сучаснасць (Мінск, 9 снежня 2017 г.)», прысвечанай 500-годдзю Рэфармацыі і 500-годдзю беларускай Бібліі. Абодва гэтыя юбілеі шырока адзначаліся ў Беларусі на працягу 2017 года. У гэты выпуск увайшлі артыкулы беларускіх і замежных аўтараў, якія прадстаўляюць Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф.Скарыны, Базельскі ўніверсітэт, Інстытут гісторыі Літвы, Універсітэт Казіміра Вялікага ў Быдгашчы, Мінскую багаслаўскую семінарыю Саюза ЕХБ у Беларусі, Тэалагічны інстытут ХВЕ (г. Мінск), Вышэйшую баптысцкую тэалагічную семінарыю ў Варшаве і інш.

У тамах зборніка асвятляюцца важныя старонкі гісторыі беларускай і еўрапейскай Рэфармацыі, Бібліі Ф.Скарыны, а таксама Пратэстанцкай Царквы Беларусі. Увазе чытача прапануюцца як біяграфічныя даследаванні, так і панарамныя гістарычныя агляды пэўных перыядаў у гісторыі пратэстантызму. Закранаюцца пытанні міжканфесійных адносін, сувязей пратэстантаў з беларускім нацыянальным рухам, сучаснага развіцця пратэстанцкіх цэркваў у Беларусі і многае іншае.

Да мерапрыемства прымеркавана выстава кніг з фондаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі. На ёй прадстаўлены прыжыццёвыя выданні М.Лютэра і Ф.Меланхтона, творы Эразма Ратэрдамскага, Біблія Марціна Лютэра (1675) і інш.

Запрашаем усіх жадаючых у інфармацыйна-выставачны цэнтр ЦНБ НАН Беларусі (вул. Сурганава, 15).

Андрэй УНУЧАК, Інстытут гісторыі НАН Беларусі
Аляксандр СЦЕФАНОВІЧ, ЦНБ НАН Беларусі